Падтрымай "Вясну" на PATREON

Тыдзень у Мінску пачаўся з судоў дапоўнена

10.04.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі, свабода мірных сходаў



Сёння ў сталічных судах разглядаюцца адміністрацыйныя справы грамадскіх актывістаў, якія бралі ўдзел у акцыях па абароне ахоўнай зоны Курапатаў, каля будынку КДБ у Мінску 24 сакавіка, а таксама на Кастрычніцкай плошчы 26 сакавіка.

У судзе Першамайскага раёну Менска 10 красавіка судзяць актывістаў **Рамана Пратасевіча, Насту Дашкевіч, Вольгу Нікалайчык, Леаніда Кулакова.** Таксама суд чакае і старшыню руху «За свабоду» **Юрася Губарэвіча.**

Суд над актывістам "Еўрапейскай Беларусі" **Леанідам Кулаковым**, які дагэтуль адбывае папярэдні арышт на 25 сутак, перанеслі на 21 красавіка. Яго вінавацяць у акцыі пратэсту па абароне Курапат.

Наста Дашкевіч завочна пакараная штрафам у памеры 15 базавых велічынь таксама за абарону Курапат.

Суд над **Раманам Пратасевічам** перанесены на 14 красавіка, паколькі суддзя прыняла рашэнне выклікаць на судовае паседжанне выкладчыкаў універсітэта, якія ў дзень акцыі ў Курапатах 25 лютага прымалі ў яго іспыт. А ў пратаколе пазначана, што ў гэты час актывіст "актыўна ўдзельнічаў у незаконным пікетаванні на будаўнічай пляцоўцы па адрасе: Мірашнічэнка, 49.

Справу **Вольгі Нікалайчык** разглядае суддзя **Іна Сідарок**. Яе вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве 24 лютага: нібыта яна выступала супраць будаўніцтва на вуліцы Мірашнічэнкі у ахоўнай зоне Курапат. Нікалайчык адмоўлена ў хадайніцтве аб вядзенні працэсу на беларускай мове. Вольга Нікалайчык аштрафаваная на 30 базавых велічынь.

Разгляд адміністрацыйнай справы ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска праваабаронцы **Таццяны Равякі**, якую вінавацяць у дробным хуліганстве і непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі па артыкулах 17.1 і 23.4 КаАП РБ. паранесены па яе заяве на 18 красавіка. Усе гэтыя правапарушэнні праваабаронца паспела “здзейсніць” 26 сакавіка, калі патрапіла на Кастрычніцкую плошчу Мінска.

Студэнта **Нікіту Калачыка** суддзя Вікторыя Шабуня пакарала штрафам у памеры 10 базавых велічынь за акцыю пратэсту.

Гэтым жа судом пенсіянерка **Ніна Багінская** аштрафаваная на 50 базавых велічыняў за акцыюю каля будынку КДБ 24 сакавіка. Такое рашэньне прыняла судзьдзя Цэнтральнага суду Менску **Вікторыя Шабуня.**

Суд Заводзкага раёна Мінска працягнуў разгляд адміністрацыйнай справы старшыні Партыі БНФ **Аляксея Янукевіча** за удзел у акцыі па абароне Курапатаў. Палітык аштрафаваны ў памеры 50 базавых велічынь па арт. 23.34 КаАП.

У судзе Савецкага раёна Мінска запланаваны разгляд адміністрацыйнай справы актывіста «Маладога фронта» **Рамана Васільева**. На яго складзены пратакол па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемства) - за ўдзел у акцыях па абароне Курапатаў.

Перад слуханнямі Раман распавёў, як трохі здзівіўся, калі ў СІЗА №1 яму перадалі позву ў суд. (Нагадаем, яго затрымалі на некалькі дзён па “справе патрыётаў”). Як піша “Новы Час”, Раман паведаміў, што хацеў бы атрымаць штраф, але гатовы маральна і фізічна (ён сабраў торбу з рэчамі для адбыцця пакарання у ізалятары) да арышту. Балазе, цягам года Раман ужо двойчы прыцягваўся да адказнасці паводле артыкула 23.34 КоАП.

Справу Рамана Васільева разглядаў суддзя **Аляксандр Волк.** Адвакат хадайнічаў пра прывод сведкаў у суд, каб дапытаць іх пра дэталі правапарушэння Рамана Васільева. Суд пагадзіўся і абвясціў перапынак да 14 гадзін. Пасля перапынку Рамана Васільева аштрафавалі на 50 базавых велічынь.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY